**Матырка, В.** Цяжкае раненне ў афганскіх гарах / В. Матырка // Лепельскі край. — 2019. — 15 лют. — С. 3.

# ЦЯЖКАЕ РАНЕННЕ Ў АФГАНСКІХ ГАРАХ

*9 лютага ў мінскім Цэнтральным Доме афіцэраў адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны 30-годдзю вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Сярод прысутных гасцей быў і старшыня Лепельскага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» **Сяргей Крывель**.*





Работа лепельскай арганізацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў была высока адзначана на рэспубліканскім узроўні, за што Сяргею Мікалаевічу была аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Спецыяльная грамата і каштоўны падарунак былі ўручаны ветэрану намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалаем Снапковым.

Дванаццаць гадоў Сяргей Крывель узначальвае раённую арганізацыю «афганцаў». За гэты час зроблена нямала добрых спраў. Дзейнасць арганізацыі пастаянна знаходзіць адлюстраванне на старонках нашай газеты. Напярэдадні юбілейнай памятнай даты ён пагадзіўся распавесці пра сваю службу ў той краіне, дзе атрымаў цяжкае раненне. Пакуль слабадскія школьнікі з цікавасцю разглядаюць гадзіннік, які ў якасці каштоўнага падарунка Сяргей Мікалевіч атрымаў ад Прэзідэнта, ветэран няспешна вядзе свой аповед.

– У Афганістан я трапіў у ліпені 1982-га. Усе ведалі, што едзем «туды» выконваць інтэрнацыянальны абавязак. Вось і Афганстан. Прызямленне ў Кабуле. Хоць у арміі не першы дзень, але непрывычнымі спачатку былі штодзённыя абстрэлы нашымі войскамі варожых пазіцый. Такое не для слабанервовых, калі цягам 30–40 хвілін над тваёй галавой праносяцца снарады. На наступны дзень прыехаў за мной зменшчык, і мы на БТРы паехалі ў Герат. Горад лічыўся другой сталіцай Афганістана. Вельмі прыгожы, старажытны. Скрозь па 130-кіламетровым маршруце ад Шынданта да Герата многа пашкоджанай нашай тэхнікі па абочынах дарогі. У бездані ляжаць спаленыя каркасы машын, знявечаная бронетэхніка. Непрывычным было бачыць абеліскі загінулым нашым салдатам.

У Гераце быў на пасадзе камандзіра мінамётнага ўзвода. Праз некалькі месяцаў паехаў на пастаяннае месца ў адну з горных застаў. У нашы абавязкі ўваходзіла прыкрываць агнём мінамётаў участак дарогі Кушка–Шындант, якая праходзіла за чатыры кіламетры ад іранскай граніцы.

Бытавыя ўмовы на заставе былі значна лепшымі, чым у палку. Намнога лепшай была сітуацыя з хваробамі. На перавале не так пакутавалі ад інфекцыйных захворванняў. Пітная вада была свая – з крыніцы, а не прывазная. Ежу таксама гатавалі самі. Была нават свая невялікая лазня. А для салдата што самае галоўнае – быць накормленым і ў чыстае апранутым. У сапёраў за некалькі баранаў разжыліся дызельнай электрастанцыяй.

Самымі незабыўнымі для мяне былі апошнія дні, якія правёў у Афганістане, калі атрымаў цяжкае раненне. Здарылася гэта перад Новым годам – 24 снежня 1983 года. Тры дні калоны не хадзілі. Была забарона з-за кепскіх метэаралагічных умоў. А потым усталявалася добрае надвор'е. Зверху далі дазвол на праход калон, пасля чаго на нашым участку пачаўся абстрэл. «Духі»

абстралялі калону. Мы з камандзірам 2-га ўзвода, прозвішча ўжо не памятаю, пайшлі ў абход. Было «весела». Незразумела, дзе што гарыць. Галаўную машыну калоны падпалілі. Утварылася вялікая «пробка». Калі мы падышлі да «духаў» амаль на адлегласць кідка гранаты, падарваліся на міне. Адразу гэтага і не зразумеў. Адкрываю вочы – рука вывернута, аўтамат у руцэ застаўся, толькі без ствольнай каробкі. Кідаю погляд на нагу, а там толькі дымок ідзе. Можна сказаць, што аўтамат выратаваў мяне ад асколкаў, яны пайшлі вышэй. Пашанцавала і тым, што быў абуты ў боты, а не ў красоўкі. Я атрымаў раненне нагі, а мой таварыш застаўся без вачэй. На працягу наступных пятнаццаці хвілін ён здолеў перацягнуць мне нагу партупеяй. Потым падышлі байцы, на бушлатах нас спусцілі ўніз. Варожую пазіцыю закідалі гранатамі. На гэтым мая служба ў Афганістане скончылася. Цэлы месяц ляжаў у шпіталі ў Кушцы, а потым пераправілі ў Ташкент. Затым праходзіў лячэнне ў Маскве. Там лёс звёў са знакамітым хірургам, прафесарам Елізаравым. Ён знайшоў цёплыя словы, каб суцешыць, падтрымаць і падбадзёрыць. Такім чынам я застаўся ў арміі. Далейшую службу праходзіў у Лепельскім ваенкамаце. Неаднаразова даводзілася суправаджаць прызыўнікоў у Віцебск у аблваенкамат. Мы ўжо тады ведалі, што многія з іх пойдуць служыць у Афганістан.

**Валерый ТУХТА**

**На здымках:** *Сяргей Крывель са слабадскімі школьнікамі;*
*Сяргей Крывель (злева) у г. Герат у 1983 г.*